

**Да Дня Волі, 25-га сакавіка, ў Кафедральным Саборы Жыровіцкай іконы Божай Маці, штат Агайя, США, былі адслужаныя Малебены "За Беларускі народ" ды "У часе народнай бяды". Ад імя Архіярэйскага Сабору Беларускай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы малітоўную службу ўзначаліў Мітрапаліт Віленскі і Нью-Ёркскі Сэрафім разам з духавенствам, вернікамі ды гасьцямі Сабору.**

**З сэрцам, поўным горычы і веры шчыра ўсе маліліся:**

**– За Богам сьцеражоную краіну нашу Беларусь і ўвесь беларускі народ, за стойкасьць у веры, мужнасьць у выпрабаваньнях і вернасьць свайму народу ўсіх нас.**

**– Каб Госпад пачуў голас малітваў нашых, і каб адвярнуў ад нас брутальную расейска-фашысцкую акупацыю, якая нас напаткала.**

**– Каб Госпад вызваліў нас з сецяў сьмяротных лютага ды лукавага усходняга ворага.**

**– Каб Госпад Бог даў умацавацца ў беларускім народзе духу справядлівасьці, згоды, братняй любові і шчырай пабожнасьці.**

**– Каб Госпад Бог дабраславіў і ня даў згінуць марна талентам, якімі Ён шчодра надарыў беларускі народ.**

**– Каб Госпад пачуў малітву нашую, і каб даў нам і братньяму украінскаму народу, што самаахвярна вальчыць супраць расейскіх загарбнікаў, перамогу над супольным ворагам нашай незалежнасці.**

**– Глянь, Госпадзе, на няшчасьці, якія абрынуліся на народ Украіны, і дабраслаў нашых беларускіх ваяроў, каторыя прыйшлі яму на дапамогу, каб выканаць Божый запевет любові да бліжняга, ахвяруючы ды рызыкуючы сваім жыцьцём.**

**– Ты, Госпадзе, навучыў нас Сваім прыкладам, што няма большай любві калі хто душу (жыццё) сваю пакладзе за бліжняга свайго, дабраслаў і нас прыйсці саячасова на дапамогу змагарам за волю і незалежнасьць нашых народаў.**

**– Сусьветны Уладару, як дабраславіў Ты войска нашага Вялікага Князя Літоўскага Альгерда ў 1362 годзе на рацэ Сіні Воды перамагчы акупацыйную усходнюю арду ды вызваліць ад яе тады Паўднёва-Ўсходнія землі Украіны, так і цяпер дапамажы нам разам перамагчы гэтую новую крывавую акупацыйную маскоўскую арду.**

**– Ты ведаеш, Госпадзе, што ня мёртвыя будуць хваліць Цябе, і ня тыя, што ў апраметнай, але мы, жывыя, хвалім Цябе і з болем сэрца молімся Табе: дай нам перамогу над ворагам-акупантам.**

**– Каб Госпад узьняў нас ад брамаў сьмерці ды паняволення, каб нам ня згінуць, але перамагчы ворага і жыць вольна.**

**Молімся Табе з сэрцам, поўным горычы і веры: пачуй нас і прывядзі да справядлівай перамогі.**

**Жыве Беларусь!** **Слава Україні!**

